## РЭФЕРАТ

Гулідава Вольга Аляксандраўна

**Творчасць Яўгеніі Янішчыц: эвалюцыя мастацкага мыслення**

**Ключавыя словы:** лірыка, паэзія, мастацкае мысленне, лірычная гераіня.

**Аб'ект даследавання** – паэтычныя творы Я. Янішчыц са зборнікаў «Снежныя грамніцы», «Дзень вечаровы», «Ясельда», «На беразе пляча», «Пара любові і жалю», «Каліна зімы».

**Прадмет даследавання** – эвалюцыя мастацкага мыслення Я. Янішчыц.

**Мэта работы** – даследаваць эвалюцыю мастацкага мыслення Я. Янішчыц.

**Метадалагічнай базай** навуковай работы сталі найноўшыя напрацоўкі ў галіне гісторыі і тэорыі літаратуры, крытычныя і літаратуразнаўчыя артыкулы. Для вырашэння пастаўленых задач выкарыстаны метад крытычнага аналізу навуковай літаратуры, асноўныя прыёмы кагнітыўнага і кампаратыўнага аналізу, герменеўтычны метад.

**Навуковая навізна.** Дыпломная работа з'яўляецца літаратуразнаўчым даследаваннем праблемы эвалюцыі мастацкага мыслення Яўгеніі Янішчыц, дзе прасочана трансфармацыя асноўных тэм і матываў лірыкі паэткі, разгледжана спецыфіка рэпрэзентацыі ключавых вобразаў у вершаў розных гадоў.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Матэрыялы даследавання маюць навукова-тэарэтычную каштоўнасць і могуць выкарыстоўвацца пры выкладанні дысцыплін літаратуразнаўчага профілю, падрыхтоўцы спецсемінараў і спецкурсаў па беларускай літаратуры, а таксама пры напісанні курсавых і дыпломных работ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Scanned by CamScanner